*П. А. МІХАЙЛАЎ*
*кандыдат філалагічных навук*

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ЗАСЦЯРОГІ ДЛЯ ЦЯЖАРНЫХ ЖАНЧЫН

Святым абавязкам для кожнага чалавека ва ўсе часы лічылася падараваць гэтаму свету новае жыццё, пакінуць пасля сябе нашчадка. Прымаючы пад увагу такое велізарнае, ледзьве не сімвалічнае значэнне, якое надавалася факту нараджэння ў сям'і дзіцяці, перыяд чакання гэтай падзеі суправаджаўся шэрагам самых разнастайных правілаў жыцця і ўзаемаадносін з навакольным светам цяжарнай жанчыны. Людзі заўсёды ўсведамлялі, што паводзіны, характар і ўмовы існавання будучай маці істотна ўплываюць на здароўе і жыццё дзіцяці, якое яна выношвае. Таму ўжо з даўніх часоў у кожнага народа існаваў сапраўдны "кодэкс" абавязковых правілаў паводзін для цяжарных жанчын. Гэтыя правілы павінны былі забяспечыць нараджэнне здаровага дзіцяці, спрыянне і дабрабыт у гаспадарцы, захаваць здароўе парадзіхі. У некаторых найбольш старажытных народаў яны нават досыць шырока адлюстраваны ў пісьмовых літаратурных помніках[1].

Існавалі і існуюць такія правілы і ў беларускіх сем'ях, асабліва на вёсцы, у тым ліку і на Тураўшчыне[2]. Уважлівы аналіз сабранага матэрыялу дазваляе аб'яднаць іх у некалькі самастойных груп.

Першая група традыцыйных народных засцярогаў павінна была забяспечыць паспяховыя лёгкія роды, здароўе і прывабны знешні выгляд будучага дзіцяці. Таму на Тураўшчыне цяжарнай жанчыне забаранялася:

1) "***announcementsнеможна перэступаць церэз вероўку, оглоблю, мучку і кросна, коб не було закручанэ дзіця***";

2) нельга перакрыўляць (паказваць, дэманстраваць, высмейваць) фізічныя недахопы навакольных людзей, напрыклад, кульганне, дэфекты мовы, аднавокасць і г.д., бо ўласнае дзіця народзіцца з аналагічнымі дэфектамі;

3) "***колі гледзець на гадзюку або роскідаць яйца ластоўкі, то дзіця рабое будзе***";

4) у час пажару нельга хапацца рукамі за цела, бо дзіця народзіцца з чырвонай плямай на тым месцы, за якое са страху ўхапілася цяжарная жанчына;

5) забаранялася біць свойскіх жывёл і птушак (свіней, кароў, курэй і г.д.), бо дзіця з'явіцца на свет са слядамі пабояў;

6) цяжарная жанчына не павінна ніколі ні ў кога, хто ў яе прысутнасці есць, прасіць ежы сабе, інакш і дзіця ўсё жыццё будзе жабраваць, кленчыць есці;

7) не рэкамендавалася будучай парадзісе і ўзважвацца, каб не нашкодзіць нармальнаму росту і развіццю зародка дзіцяці;

8) "***неможна носіць хлеб і круп ніякіх у фартуху, бо, кажуць, дзіця будзе ў каждого просіць***";

9) "***неможна гледзець і плёваць на падаль, бо будзе з рота ў дзіцяці воняць***";

10) цяжарная жанчына не павінна была гаварыць "***от воняе***", бо "***ў дзіця будзе воняць з рота***";

11) "***неможна становіцца на парозе, бо будзе доўго дзіця ісці***";

12) мачыцца дазвалялася толькі на чыстую зямлю, на якой не павінны валяцца трэскі, салома і г.д.;

13) "***берэменной неможна гледзець на мерцвеца, бо будзе жоўтэе дзіця, неможна і ў окно гледзець, як везуць мерцвеца; на могліцы не йдуць і пры покойніку не стояць***";

14) забаранялася цяжарнай жанчыне і наведванне парадзіхі, каб, відаць, не выклікаць датэрміновыя роды ў самой сябе;

15) нельга было ні з кім сварыцца, а таксама пераходзіць каму-небудзь дарогу.

Другая група традыцыйных засцярогаў павінна былі прадухіліць нанясенне шкоды сваёй гаспадарцы, навакольнай прыродзе і людзям. У сувязі з гэтым цяжарнай жанчыне не дазвалялася:

1) палоць лён і пшаніцу, інакш "***на льне будзе серуха*** (павітуха)***, так сплеце лён, шчо только ее вупаліць можно!***";

2) нельга сеяць агуркі і садзіць капусту — ураджаю не будзе;

3) забаранялася "***убіраць гуркі, рубаць і засольваць капусту, зрываць яблыка***", бо

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэтая садавіна і гароднiна папсуецца і не будзе доўга захоўвацца;

4) каб не загінула расада, не рэкамендавалася "***палівацъ огарод***";

5) не дазвалялася цяжарнай жанчыне "***пекці хлеб***", бо ён не ўдасца;

6) нельга было быць "***кумой на хрэсцінах і дружкой на свадзьбе***";

7) "***неможна ходзіць у цэркву***";

8) катэгарычна забаранялася лазіць на дрэва, бо яно абавязкова засохне.

Трэцяя група правілаў паводзін цяжарнай жанчыны нешматлікая і скіравана на павелічэнне сямейнга дабрабыту: ***Берэменна должна сеяць гарбузы, то будуць добрэ родзіць***. Дарэчы, гарбузовыя семечкі, "***гарбузікі***", падавалі ўсім гасцям як пачастунак на хрысцінах: ***Гарбузікі ўсім даюць на зборынах, після тарэлку стаўляць на стол і кладуць грошы, хто сколько покладзе*** (в. Сямігосцічы Столінскага р-на)[3].

І, нарэшце, чацвёртая група засцярогаў мела падвойны, сінкрэтычны сэнс: здзяйсненне пэўнага ўчынку павінна было станоўча адбіцца на ўласным дабрабыце і нашкодзіць чужому. Гэта адносіцца, перш за ўсё, да такога асуджальнага сярод людзей дзеяння, як крадзеж: ***Як берзменна ўкрадзе ў кого шчо, то ў ее будзе веціса, а ў того, у кого ўкрадзе — сем год не будзе***!

Такім чынам, увсеь гэты "кодэкс законаў для цяжарнай жанчыны" кіраваўся клопатам аб здароўі будучага дзіцяці і яго маці, дабрабытам і спакоем у сям'і. Калі ж і надараліся ў жанчыны нейкія праблемы са здароўем, то лячылі яе таксама спадручнымі сродкамі: "***жыщец давалі берэменным жонкам, шоб іх жога не жогала***".

Ва ўсе часы будучых бацькоў хвалявала пытанне, хто народзіцца ў сям'і, сын ці дачка? На Тураўшчыне, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, існавала шэраг прыкмет, па якіх мясцовыя жыхары спрабавалі вызначыць пол будучага дзіцяці: хто першы прыдзе ў хату на Каляды, мужчына ці жанчына, каго ацяліла карова, цялушку ці бычка, і г.д. Аднак, акрамя гэтых шырокавядомых спосабаў, існаваў і досыць незвычайны: ***Як дотыкалі, бралі пруточка і беглі на вуліцу: кого стрэціш — мужчыну ілі жэнщчыну, як хто берэменны, то той і родзіцца***.

У заключэнне хацелася б толькі адзначыць, што многія з апісаных вышэй засцярогаў вядомыя яшчэ з глыбокай старажытнасці і ў некаторых іншых народаў, напрыклад, жыхароў старажытнай Індыі[4]. Наяўнасць іх на тэрыторыі Беларусі сведчыць пра сапраўдную ўнікальнасць палескага краю для розных галін сучаснай навукі і неабходнасць далейшага ўважлівага вывучэння гэтага рэгіёну.

## Спасылкі

[1] Пра санскары, якія здзяйсняліся да нараджэння дзіцяці ў старажытнай Індыі, напрыклад, гл.: Пандей Р.Б. Древнеиндийские домашние обряды (обычаи). — М.: Высшая школа, 1990.— С.71—83.

[2] Матэрыял па тэме даследавання запісаны ў асноўным у в. Старажоўцы ў 1981—1982 гг. ад Жукоўскай Парасқі Мікітаўны, 1907 г.н.; асобныя факты ўзятыя з матэрыялаў "Тураўскага слоўніка" (т. 1—5, 1982—1987).

[3] Тураўскі слоўнік. Т. 1. Мн.: Навука і тэхніка, 1982. — С. 195.

[4] Пандей Р.Б. Древнеиндийские домашние обряды (обычаи). — М.: Высшая школа, 1990

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ